# ЛЕКСЕМА “ГРУНТ”: КАНТЭКСТУАЛЬНАЕ ЗНАЧЭННЕ

*Чарнавокая Вольга Пятроўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Відавочна, што нельга адэкватна вызначыць сутнасць слова, не звярнуўшыся да ўсёй лексіка-семантычнай сістэмы, як нельга даследаваць і лексіка-семантычную сістэму ў цэлым, ігнаруючы слова як асноўную яе адзінку. Адно і тое ж слова можа ўваходзіць у парадыгматычныя, у сінтагматычныя, у дэрывацыйныя адносіны. Варта прыняць да ўвагі і граматычныя структурныя адносіны слова, па якіх яно ўваходзіць у розныя граматычныя катэгорыі слоў і лексіка-граматычныя групы. Акрамя названых, слова можа ўваходзіць і ў прадметна-тэматычную ці лексіка-семантычную групу. Намі аналізуюцца парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны слоў прадметна-тэматычнай групы “зямля” (*зямля, глеба, грунт, краіна, край, старонка, аснова, зямны, земляны, грунтовы* і інш.). У артыкуле намі аналізуюцца значэнні лексемы “грунт” у мастацкім кантэксце.

У сучаснай беларускай мове слова “грунт” ужываецца з пяццю значэннямі: 1) ‘*верхні пласт зямлі; глеба; цвёрдае дно натуральнага воднага басейна; глеба марскога, рачнога і пад. дна*’; 2) ‘*пласты зямлі, якія знаходзяцца пад глебай*’; 3) ‘*тое галоўнае, на чым асноўваецца што-н.*’; 4) ‘*слой рэчыва, якім пакрыта палатно, дошка і пад., прызначаныя для жывапісу ці графікі*’; 5) ‘*састаў, якім пакрываюць паверхню, рыхтуючы яе для жывапісу ці афарбоўкі*’.

У выбраных намі мастацкіх кантэкстах лексема “грунт” ужываецца з першымі трыма значэннямі, якія падае нам тлумачальны слоўнік, а таксама набывае новыя канататыўныя адценні. Так, у творах беларускіх пісьменнікаў розных перыядаў лексема “грунт” ужываецца з наступнымі значэннямі:

I. Верхні пласт зямлі, глеба: *Ён гэтым моцным паваротам / У цвёрды грунт упёршысь ботам* (Я. Колас “Новая зямля”); *Міхал распісваў з жарам далей: – А чорны грунт куды багацей* (Я. Колас “Новая зямля”); *Ён, стараючыся не траціць паважнасці, па-мужчынску стала пакапаўся ў ламаччы, што было каля вогнішча, выбраў дзве дубовыя голькі, выразаў з іх ралцы і ўткнуў у грунт* (І. Мележ “Людзі на балоце”); *Шабета не падганяў таксама, і пакуль дапляліся да мястэчка, на цвёрды грунт лёг добры вячэрні поцемак* (І. Мележ “Людзі на балоце”); *Пастаяла, паслухала, як стукаюць яго калёсы ўпоцемку. Па мёрзлым, скамянелым грунце* (І. Мележ “Завеі, снежань”); *Жне і не азірнецца, сагнуўся, утаропіўся ў грунт, бачыць толькі*

*жытнёвыя сцяблы ды перавясла – хоць бы раз кінуў вокам на яе, на Ганну. Дык не ж...*(І. Мележ “Людзі на балоце”); *А дуб расце на добрай глебе* (Я. Колас “Новая зямля”); *Ідзе работа, сеяць трэба, / Ляжыць няўзораны грунт, / А ты й каня бяры ў прыдачу* (Я. Колас “Новая зямля”); *Пакідалі бацькоў і глебу пахану, і маёнткі...* (А. Ельскі “Гаспадарства”); *Які ж то грунт? Дзе не расце нічога* (Я. Колас “Новая зямля”).

У кантэксце слова “грунт” набывае дадатковую канатацыю – ‘зямля як паверхня, плоскасць, на якой мы стаім, ды рухаемся’: *Расставіўшы па-мужчынску ногі, моцна ўпінаючыся ў грунт, ён размашыста правёў касой, і трава шыркнула, паслухмяна лягла злева акуратнай купкай* (І. Мележ “Людзі на балоце”); *Пад нагамі адчуваўся трывалы, увесь у купінах грунт* (І. Мележ “Людзі на балоце”); *Тут пад нагамі была ўжо не падатная багна, не клятая-пераклятая чорная гразь, а цвёрды, надзейны грунт, пад якім чулася прыемная моц дрэваў* ( І. Мележ “Людзі на балоце”); *Дарога пачала паніжацца, і сыпкі пясок яе змяніўся мяккім, падатным забалочаным грунтам, на якім вырэзваліся дзве чорныя вільготныя каляіны”(*І. Мележ “Людзі на балоце”).

Яшчэ адно дадатковае значэнне – ‘глеба, якая апрацоўваецца і выкарыстоўваецца ў сельскагаспадарчых мэтах’: *Цэламу краю, бо нават сяляне заможные, імеючы грунты ўласные думаюць пакінуць іх* (А. Ельскі “Скарэй у Томск”); *Дык трэба грунт мець пад нагамі, / Каб не бадзяцца батракамі* (Я. Колас “Новая зямля”).

ІІ. Пласты зямлі, якія знаходзяцца пад глебай: *Але капае дол у горах / І страшна пеніцца, бушуе, / І грунт каменны там свіруе* (Я. Колас “Новая зямля”); *Пусціць карэнні ў грунт, абжыцца – / Было на чым разварушыцца* (Я. Колас “Новая зямля”); *У зямлі ёсць такія грунты, дзе вада спыняецца, не ідзе далей* (Я. Колас “Новая зямля”).

ІІІ. Лексема “грунт”  даволі часта ўжываецца ў мастацкіх кантэкстах у пераносным значэнні ‘тое, галоўнае на чым асноўваецца што-небудзь’: *Лабановіч, раз стаўшы на пэўны грунт і пачуўшы сябе таксама ўколатым, ужо не мог змяніць тон і лінію паводзін і ў нейкай злосці* (Я. Колас “У палескай глушы”); *Хоць матэматыка грунт усяму на свеце, але Юлька на гэтым “грунце” яшчэ слаба трымаецца”*(З. Бядуля); *Стала лепш, то трэба паправіцца з грунту, з аснавання* (А. Ельскі “Скарэй у Томск”); *Чалавек, які мае грунт, як дрэва якое пусціла свае карані* (А. Ельскі “Сынок”); *Адбяры ў чалавека грунт – згіне!* (А. Ельскі “Сынок”); *Як і не было, прапаў цвёрды грунт з-пад ног, знікла трываласць у жыцці!* (І. Мележ “Людзі на балоце”);

*Самая важная прычына ўсіх яго нягод крылася ў тым, што гэта Каліва расло на чужым грунце* (Я. Колас "На чужым грунце"); *Складваў, стараўся, а будыніна крывілася, хілілася, гатова была ў любы момант разлезціся, разламацца; не было грунту, асновы добрай у будыніны, кволай, няпэўнай будыніны яго шчасця!* (І. Мележ "Подых навальніцы"); *І от – на цебе – паспадзяваўся! Збярог грунт пад сабою!* (І. Мележ "Подых навальніцы"); *Адзін казаў, што ў радзе калгасаў зроблена толькі фармальнае абагульненне маёмасці і сродкаў, што сяляне не спадзяюцца ў цвёрдасць калгаснага грунту* (І. Мележ "Подых навальніцы"); *Трэба, разумна турбаваўся ён, каб калектывізацыя з першых жа дзён станавілася на моцны, здаровы грунт* (І. Мележ "Подых навальніцы").

Дадатковае значэнне 'поўнасцю, да асновы' лексема "грунт" набывае ў кантэксце *І там пярун спаліў да грунта хату* (А. Ельскі "Сынок").

Зыходзячы з аналізу выбраных намі мастацкіх кантэкстаў, лексема "грунт" часцей ужываецца са значэннямі 'верхні пласт зямлі, глеба', 'тое, галоўнае на чым асноўваецца што-небудзь'. Намі не зафіксаваны мастацкі кантэкст, дзе лексема "грунт" рэалізавала б значэнні: 'слой рэчыва, якім пакрыта палатно, дошка і пад., прызначаныя для жывапісу ці графікі','састаў, якім пакрываюць паверхню, рыхтуючы яе для жывапісу ці афарбоўкі', што тлумачыцца тэматыкай аналізуемых кантэкстаў.

Спіс літаратуры:

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / рэдкал.:К.К. Атраховіч (агульн. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСэ, 1977–1984.